# Рэзалюцыя Беларускага Нацыянальнага Камітэту

Беларускі Нацыянальны Камітэт на пленарным сходзе сваім 1 ліпня 1922 году, выслухаўшы рэфэрат Палітычнае Камісіі ў справе выбараў у Варшаўскі Сойм, пастанавіў:

1) Дзеля абароны правоў беларускага насяленьня ў межах Польскага Гаспадарства, задэклярованых канстытуцыяй Польшчы, прыняць чыннае ўчасьце ў выбарах у Варшаўскі Сойм.

2) Кіравацца да стварэньня адзінага сьпіску нацыянальных меншасьцяў.

3) Зацьвярдзіць умову ў справе выбарнай акцыі, падпісаную ў Варшаве 25 чэрвеня г. г. паўнамочнікам камітэту грам. Дубейкаўскім і прадстаўніком Выбарнага Камітэту Холмшчыны і Падляшыя грам. Васільчуком.

4) Даручыць Палітычнай Камісіі ўчыніць крокі, вынікаючыя з сказанае ўмовы.

5) Учыніць крокі дзеля аб'яднаньня другіх нацыянальных груп — у паразуменьні з Камітэтам Холмшчыны і Падляшыя.

6) Прыступіць да арганізацыі Беларускага Выбарнага Камітэту ў Вільні.